УДК 398.332.416:316.7(476.7)

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ ФАЛЬКЛОРНАЙ СПАДЧЫНЫ XXI СТ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАГА КАЛЯДНАГА АБРАДУ)

***І. В. Хамутова,***
*выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Вывучэнне фальклорнай спадчыны з выкарыстаннем культуралагічнай метадалогіі даследавання дае магчымасць разгледзець традыцыйную культуру ў новых аспектах, з іншых ракурсаў. Артыкул прысвечаны вывучэнню камунікатыўнага аспекту традыцыйнай заходнепалескай калядной абраднасці на сучасным этапе яе бытавання ў XXI ст. Асновай для даследавання камунікатыўнага аспекту ў традыцыйнай абраднасці з'яўляеццца тэорыя, распрацаваная А. Р. Рэдкліф-Браўнам і Б. К. Маліноўскім, якія разглядалі грамадства – сацыяльны аб'ект – як адаптыўную сістэму.

**Ключавыя словы:** Заходняе Палессе, калядная абраднасць, культуралагічнае даследаванне, фальклорная спадчына, камунікатыўны аспект.

# CULTURAL RESEARCH OF FOLKLORE HERITAGE OF XXI CENTURY ON THE EXAMPLE OF THE WEST POLESIE CAROLING RITUALISM

***I. Hamutova,***
*Lecturer of the Department of Folksong Art and Folklore of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The study of folklore heritage, using the cultural methodology of the study, gives an opportunity to consider traditional culture in other new aspects, from other viewpoints. This article is devoted to the study of the communicative aspect of the West Polesie traditional

caroling ritualism at the current stage of its existence in XXI century. The basis for the study of the communicative aspect in traditional ritualism is a theory developed by A. R. Radcliffe-Brown and B. K. Malinowski. They looked at society – the social object – as an adaptive system.

**Keywords:** West Polesie, caroling ritualism, cultural research, folklore heritage, communicative aspect.

Культуралагічнае даследаванне традыцыйнай абраднасці беларусаў будуецца на семіятычным падыходзе. Як вядома, заснавальнікам сучаснай семіётыкі з’яўляецца Ю. М. Лотман [2], які, акрамя семіятычнага разумення культурных з’яў, выдзяляе, па аналогіі з біясферай, семіясферу. Гэта дазваляе разглядаць традыцыйную культуру як сфарміраваную на працягу стагоддзяў семіятычную прастору, у межах якой здзяйсняецца камунікатыўны акт паміж адрасатам і адрасантам абраду/рытуалу. Зыходзячы з гэтага, Каляды разглядаюцца намі як час, калі прастора праз абрадавыя дзеянні напаўняецца іншым зместам, робіцца семантычна напоўненай і ўяўляе сабой асаблівую, выдзеленую з прафаннага часу семіятычную прастору. У дадзеным выпадку абрад калядавання з’яўляецца тэкстам культуры, які дазваляе выдзеліць Каляды з прафаннага часу.

Логіка-структурны падыход да вывучэння традыцыйнай абраднасці дазваляе прааналізаваць складовыя часткі каляднага цыкла абрадаў з выяўленнем пэўных аспектаў яго функцыянавання. У дадзеным артыкуле акцэнт робіцца на камунікатыўны аспект функцыянавання заходнепалескага калядавання.

Камунікацыя суправаджае чалавека на працягу ўсяго жыцця. Пры гэтым яна мае асаблівасці ў пэўнай семіясферы. Абрадавая камунікацыя мае спецыфіку і адрозніваецца ад сацыяльна-побытавай штодзённай камунікацыі. Даследчыкі выдзяляюць 3 тыпы адрасата ў абрадавай камунікацыі. Першы тып – эксплíцытныя адрасаты, выразна пазначаныя ў тэксце праз прамы зварот [1, с. 76]. Другі – імпліцытныя ці нулявыя [Там жа, с. 79], калі, звяртаючыся да каго/чаго-небудзь, апелявалі да сакральнага адрасата. Трэці – замяшчаючыя [4]. Як правіла, гэта – рытуальныя дублёры вышэйшых персанажаў [Там жа, с. 81].

Выдзяленне кожнага тыпу адрасатаў у калядным комплексе абрадаў магчыма пры даследаванні абрадавых кодаў, з якіх складаецца структура абраду.

Методыка выдзялення абрадавых кодаў была распрацавана М. І. і С. М. Талстымі, а пазней дапрацавана Т. А. Пладуновай для вывучэння і мастацкага рэканструявання абрадаў [3, с. 51].

Такім чынам, у культуралагічным даследаванні калядная абраднасць разглядаецца як комплекс абрадавых кодаў, кожны з якіх мае сваё семантычнае значэнне:

– акцыянальны – ход абрадавых падзей;

– тэмпаральны – час адпраўлення абрадавых падзей;

– лакатыўны – месца правядзення абрадавых падзей;

– персанальны – кола ўдзельнікаў, персанажы абрадавых падзей;

– атрыбутыўны – абрадавая атрыбутыка і прылады ў абрадавых дзеях;

– музычна-вербальны – песеннае і вербальнае суправаджэнне абрадавых падзей;

– музычна-інструментальны – інструментальнае суправаджэнне абрадавых падзей;

– пластычны – пластычнае ўвасабленне і харэаграфічнае суправаджэнне абрадаў.

У абрадавых дзеях (акцыянальнасці) выяўлена захаванасць элементаў традыцыйнага светапогляду мясцовых жыхароў: кожная дзея мела магічны сэнс і звязвалася з будучым ураджаем, дабрабытам, здароўем, плоднасцю.

Тэмпаральная прымеркаванасць Каляд да пачатку гадавога цыкла скіравана на пераадоленне лімінарнасці часу, хаосу (цемры) праз смехавы канон у калядаванні, а таксама музычна-вербальны і музычна-інструментальны абрадавыя коды.

Лакатыўны код каляднай абраднасці сімвалізуе мяжу паміж светам жывых і памерлых, а таксама канал сувязі са звышнатуральнымі істотамі.

Персанальны код выяўляе адзінства вясковай супольнасці ў абрадзе (прымаюць удзел жыхары вёскі рознага ўзросту і гендарнай прыналежнасці).

Атрыбутыўны код увасоблены ў калядаванні з салярным сімвалам – зоркай (гл. мал.); у абрадавым пераапрананні, якое накіравана на падпарадкаванне хаосу ў святочны перыяд і пабудову гармоніі з навакольным светам у прафанны час.

Пластычны код каляднай абраднасці выяўляецца праз рухі калядных персанажаў і з'яўляецца складовай часткай абрадавай камунікацыі.



*Мал.* Шчадраванне з зоркай і «казой». Аг. Хаціслаў. 2025 г.

У сучаснасці камунікатыўны аспект у традыцыйнай абраднасці змяняецца, што можна растлумачыць пры дапамозе тэорыі, распрацаванай А. Р. Рэдкліф-Браўнам і Б. К. Маліноўскім, якія разглядаюць грамадства – сацыяльны аб'ект – як адаптыўную сістэму.

Пад уздзеяннем такіх новых сацыяльных фактараў, як змяненне тыпу культуры, агульнадаступнасць сродкаў масавай інфармацыі, доступ у глабальную сетку Інтэрнэт і інш., адбываецца трансфармацыя абрадавых кодаў і змены абрадавай камунікацыі ў выніку. Сакральныя адрасаты ў калядаванні распаўсюджана замяняюцца на экспліцытныя (рэальныя).

Падводзячы высновы, трэба адзначыць, што культуралогія як навука дае магчымасць даследаваць традыцыйную абраднасць у новых аспектах, якія не закраналіся ў этнаграфічных, этнамузыкалагічных і энталагічных даследаваннях. Сучасная культуралогія пабудавана на прынцыпах гістарызму і адлюстроўвае культуру як жывую з'яву, якая трансфармуецца пад уздзеяннем сацыяльных фактараў.

1. *Ковалева, Р. М.* Горизонты коммуникации в календарно-обрядовом фольклоре: сакральное и мирское / Р. М. Ковалева // Национальные культуры в межкультурной коммуникации : сб. науч. ст. по материалам II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12–13 апр. 2017 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Э. А. Усовская (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2017. – С. 73–84.

2. *Лотман, Ю. М.* Семиосфера : сб. / Ю. М. Лотман. – СПБ : Искусство-СПБ, 2000. – 704 с.

3. *Пладунова, Т.* Актуалізацыя этнафанічных традыцый каляндарна-абрадавага цыкла ў сучаснай культурнай прасторы / Т. Пладунова // Фальклардыстычныя даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. / Рэсп. ін-т выш. шк. ; пад навук. рэд. Р. М. Кавалевай, В. В. Прыемка. – Мінск, 2010. – Вып. 7. – С. 50–55.

4. *Хомутова, И. В.* Коммуникативные функции колядной обрядности Западного Полесья и их трансформация в XXI в. / И. В. Хомутова // Культурное пространство: генезис и трансформации : тезисы докладов VIII всерос. науч.-практ. конф. «Культурное пространство: генезис и трансформации», Санкт-Петербург, 25–26 окт. 2023 г. / М-во культуры Рос. Федерации, С.-Петерб. гос. ин-т культуры. – СПб., 2023. – С. 284–296. – URL: https://www.spbgik.ru/upload/iblock/db4/awp31he2fy3xuyu6l6a1awynnsulykha/Tezisy-Kulturnoe-prostranstvo-Genezis-i-transformatsiya-el.-versiya.pdf (дата обращения: 27.04.2024).